НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Дзяржаўная навуковая ўстанова
«ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ
імя К.КРАПІВЫ»

УДК 792.2 (476.5)

**ВАЛАНЦЭВІЧ**
**Наталля Сяргееўна**

# ТЭАТРАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

17.00.01. – тэатральнае мастацтва

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата мастацтвазнаўства

Мінск – 2005

Работа выканана ва ўстанове адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў"

Навуковы кіраўнік – доктар мастацтвазнаўства, прафесар, рэктар УА "БДАМ" **Р.Б.Смольскі**

Афіцыйныя апаненты – доктар мастацтвазнаўства, прафесар, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела тэатральнага мастацтва ДНУ "ІМЭФ імя К.Крапівы НАН Беларусі" **А.В.Сабалеўскі**

кандыдат мастацтвазнаўства, вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі **А.А.Лабовіч**

Апаніруючая арганізацыя – Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры

Абарона адбудзецца "29" красавіка 2005 г. у 17.00 на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Д.01.42.02 у ДНУ "ІМЭФ імя К.Крапівы НАН Беларусі" (220072, г.Мінск, вул.Сурганава, 1, корп. 2,
к. 301.
Тэл. вучонага сакратара (017) 284-23-81.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ "ІМЭФ імя К.Крапівы НАН Беларусі".

Аўтарэферат разасланы "26" сакавіка 2005 г.

Вучоны сакратар
Савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства В.І.Жук

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Сучасны этап развіцця беларускага тэатразнаўства характарызуецца значным павышэннем увагі да праблем гісторыі айчыннага тэатральнага мастацтва – ва ўсім багацці яго зместу і форм увасаблення. На сённяшні дзень у даследаванні тэатральнай культуры Беларусі XIX – пачатку XX ст. накоплены вялікі фактычны матэрыял, разгледжаны рэпертуар і выканальніцкае майстэрства шматлікіх тэатральных труп, якія выступалі ў беларускіх гарадах. Між тым рэгіянальнае сцэнічнае мастацтва дадзенага перыяду з'яўляецца адной з найменш вывучаных з'яў гісторыі беларускага тэатра.

Вывучэнне рэгіянальнай культуры становіцца адным з перспектыўных напрамкаў у беларускай навуцы. Актуальнасць тэмы дысертацыі тлумачыцца ў першую чаргу неабходнасцю прадставіць больш поўную і дакладную карціну развіцця тэатральнага мастацтва ў Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст., бо з-за неаб'ектыўнага падыходу многія з'явы тэатральнага мастацтва Беларусі азначанага перыяду замацаваліся ў грамадскай і навуковай свядомасці за культурамі розных народаў і краін.

Распрацоўка дадзенай навуковай праблемы таксама абумоўлена адсутнасцю прысвечаных ёй спецыяльных тэатразнаўчых прац. Пры даследаванні тэатральнай культуры XIX – пачатку XX ст. асноўная ўвага сканцэнтроўвалася на вывучэнні гісторыі рускага і часткова польскага прафесійнага тэатра ў краі. У той жа час такі самакаштоўны пласт тэатральнай культуры, як аматарскі тэатр, у тэатразнаўчым ракурсе амаль не распрацаваны. Да таго ж некаторыя павятовыя гарады Віцебскай губерні цяпер адносяцца да Расіскай Федэрацыі (Веліж, Невель, Себеж) і Латвійскай Рэспублікі (Дынабург (з 1893 г. – Дзвінск, сучасны Даўгаўпілс), Люцын, Рэжыца) і ўвогуле "выпалі" з тэатральнага кантэксту Беларусі.

У грамадстве існуе навуковы інтарэс да рэгіянальнай культуры мінулых стагоддзяў, і таму натуральным падаецца з'яўленне даследавання па гісторыі тэатральнага мастацтва Віцебскай губерні XIX – пачатку XX ст. Дадзеная праца будзе мець важнае значэнне для захавання і папулярызацыі нацыянальнай культурна-гістарычнай спадчыны.

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі.** Даследаванне выканана ў адпаведнасці з Планам навукова-даследчых прац Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў на 2001–2005 гг. Матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваліся пры распрацоўцы фундаментальных даследаванняў на кафедры сусветнай літаратуры і культуралогіі Полацкага дзяржаўнага універсітэта (2000–2001 гг.). Даследаванне звязана з комплекснымі работамі па вывучэнні гісторыі беларускага тэатра, якое праводзіцца аддзелам таатральнага мастацтва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

**Мэта і задачы даследавання.** Мэтай працы з'яўляецца выяўленне характэрных рыс і раскрыццё сутнасных заканамернасцей развіцця тэатральнай культуры Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст.

Мэта даследавання вызначыла асноўныя задачы:

- раскрыць арганізацыйныя прынцыпы фарміравання тэатральнай культуры Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст.;
- паказаць генезіс і дынаміку развіцця тэатральных форм у Віцебскай губерні, раскрыць характар іх узаемаадносін і ўзаемаўплыву;
- вызначыць мастацкія асаблівасці тэатральнага працэсу ў Віцебскай губерні ў кантэксце развіцця беларускага і агульнаеўрапейскага тэатра XIX – пачатку XX ст.;
- ахарактарызаваць сувязі рэгіянальнага тэатра Віцебскай губерні з польскім, рускім і ўкраінскім сцэнічным мастацтвам XIX – пачатку XX ст.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ект – увесь комплекс тэатральна-культурных з'яў, які склаўся і заканамерна развіваўся на тэрыторыі Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст. Прадмет – арганізацыйныя аспекты фарміравання і мастацкія асаблівасці тэатральнай культуры Віцебшчыны XIX – пачатку XX ст., якія складаюць спецыфіку развіцця рэгіянальнага тэатра азначанага перыяду.

**Гіпотэза.** Пад уздзеяннем уласных глыбінных прычын і ў працэсе ўзаемадзеяння з аналагічнымі з'явамі мастацкіх культур суседніх народаў на тэрыторыі Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст. сфарміравалася развітая тэатральная культура. Пэўныя культурна-гістарычныя ўмовы шмат у чым перадвызначылі спецыфіку яе мастацкіх і арганізацыйных асаблівасцей. У Віцебскім рэгіёне шырокае распаўсюджанне атрымалі тыя ж тэатральныя формы, якія былі характэрны для іншых рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** Метадалагічную аснову дысертацыі склалі асноўныя палажэнні тэатразнаўства і гістарыяграфіі, культуралогіі, тэорыі і гісторыі культуры. Метадалогія даследавання абапіраецца на навуковыя работы Г.Барышава, У.Няфёда, А.Сабалеўскага, А.Мальдзіса, Ю.Пашкіна, С.Сяльверставай, Т.Гаробчанкі, Р.Смольскага, В.Салеева, У.Конана, В.Дадзіёмавай, расійскіх мастацтвазнаўцаў – І.Пятроўскай, А.Клінчына, І.Свірыды. Пры распрацоўцы метадалогіі былі ўлічаны палажэнні, прадстаўленыя ў фундаментальных даследаваннях: «Гісторыя беларускага тэатра», «История русского драматического театра», «Очерки русской культуры XIX века», «Русская художественная культура в конце XIX – начале XX века» і «Тэатральная Беларусь: Энцыклапедыя».

Даследаванне грунтуецца на агульнанавуковым *метадзе сістэмнага аналізу*, які прадугледжвае комплексны падыход да вывучэння тэатральна-гістарычных працэсаў у Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст. у іх абумоўленасці сацыяльна-палітычнымі і агульнакультурнымі фактарамі. Атрыманню навуковых вынікаў садзейнічалі навукова-тэарэтычныя метады (*аналіз, сінтэз, інтэрпрэтацыя*). Спецыфічнымі метадамі даследавання з'яўляюцца *структурна-тыпалагічны і функцыянальны аналіз.* Абодва скіраваныя на разгляд тэатральнай культуры рэгіёна як сістэмы і на выяўленне яе функцый. Для вырашэння асноўных задач дысертацыі выкарыстоўваліся *метад параўнальнага аналізу*, які дазволіў вылучыць

агульныя рысы ў станаўленні розных тэатральных форм у Віцебскай губерні, і *метад мастацтвазнаўчага аналізу*, з дапамогай якога вызначаны мастацкія асаблівасці тэатральнага працэсу Віцебскага рэгіёна.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Дысертацыя з'яўляецца першым фундаментальным даследаваннем тэатральнай культуры Віцебскай губерні XIX – пачатку XX ст.

- Аўтарам былі здзейснены сістэмныя пошукі ў архівах і бібліятэках Беларусі і Расіі. У выніку ўдалося выявіць мноства новых матэрыялаў па гісторыі айчыннай тэатральнай культуры, якія ўпершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак.
- Упершыню зроблена рэканструкцыя тэатральнага працэсу ў Віцебскім рэгіёне ў XIX – пачатку XX ст. у сувязі з агульнымі тэндэнцыямі развіцця нацыянальнага і агульнаеўрапейскага тэатра.
- Выяўлены заканамернасці і асаблівасці функцыяніравання рэгіянальнага тэатра ў XIX – пачатку XX ст. на агульным сацыякультурным фоне. Тэатральнае мастацтва разглядаецца не адасоблена ад тагачасных рэаліяў жыцця грамадства, а ўпісана ў кантэкст эпохі.
- Упершыню ў беларускім тэатразнаўстве вызначаны мастацкія і арганізацыйныя аспекты станаўлення і развіцця аматарскага тэатра рэгіёна ў шчыльным кантакце з прафесійным сцэнічным мастацтвам.
- Здзейснена сістэмнае даследаванне тэатральнай культуры Віцебшчыны з выкарыстаннем як дыяхранічнага (у гістарычным развіцці), так і сінхранічнага (ва ўзаемасувязях і ў прасторавым ахопе) падыходаў.
- Гісторыя тэатра на Беларусі разглядаецца не ў сучасных, а ў тагачасных тэрытарыяльных межах краіны, што дазваляе даследаваць тэатральнае мастацтва не толькі ў буйных, але і ў невялікіх павятовых гарадах Віцебскай губерні.
- Вызначана роля гарадскога насельніцтва ў фарміраванні тэатральнай культуры Віцебскага рэгіёна.

Значнасць атрыманых вынікаў абумоўлена сувяззю прадмета даследавання з актуальнымі праблемамі сучаснага тэатразнаўства. Матэрыялы і атрыманыя вынікі дысертацыі паглыбляюць уяўленні аб нацыянальнай культуры, якія існуюць у беларускай навуцы, садзейнічаюць далейшаму ўдасканаленню навуковай распрацоўкі праблем вывучэння тэатральнай культуры Беларусі XIX – пачатку XX ст.

**Практычная (сацыяльная, эканамічная) значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы даследавання могуць выкарыстоўвацца пры стварэнні базы дадзеных аб тэатральнай культуры Беларусі XIX – пачатку XX ст. у раздзеле, прысвечаным тэатру Віцебскай губерні, у музейнай дзейнасці, дзе паспрыяюць стварэнню больш дакладнага і грунтоўнага ўяўлення аб тэатральнай культуры Віцебскага рэгіёна ў XIX – пачатку XX ст., вызначэнню яе месца ў гісторыі беларускага тэатра. Вынікі даследавання можна прымяняць пры чытанні курсаў па гісторыі і тэорыі культуры, тэатральнай крытыкі і журналістыкі, пры стварэнні навукова-практычных выданняў і вучэбных дапаможнікаў па айчыннай гісторыі, гісторыі мастацтва і культуралогіі.

Тэарэтыка-метадалагічныя прынцыпы даследавання могуць стаць асновай для распрацоўкі канкрэтных методык вывучэння тэатральнай культуры іншых рэгіёнаў Беларусі.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. У арганізацыі тэатральнай справы Віцебскага рэгіёна ў XIX – пачатку XX ст. адбыліся кардынальныя змены ў сферы фінансавання тэатраў, цэнзурнай палітыкі, глядацкай аўдыторыі, камплектавання труп і пракату рэпертуару.

2. Суіснаванне і ўзаемадзеянне прафесійнага і аматарскага тэатра з'яўляецца адной з асноўных тэндэнцый у сцэнічным мастацтве Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст.

3. Па меры развіцця тэатральнага працэсу на тэрыторыі Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст. змянялася эстэтыка сцэнічнага мастацтва, адбывалася паступовае станаўленне новага творчага метаду – рэалізму.

4. Рэгіянальны тэатр меў мноства сувязей і ўзаемадачыненняў з аналагічнымі з'явамі ў нацыянальнай і агульнаеўрапейскай тэатральна-культурнай прасторы XIX – пачатку XX ст.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем. Упершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак выяўленыя і сістэматызаваныя аўтарам бібліятэчныя і архіўныя звесткі (каля 250 адзінак), якія тычацца гісторыі тэатра Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст. ва ўсіх яго праявах. У рабоце прадстаўлена агульная карціна развіцця тэатральнага мастацтва ў Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст. Аўтарам вызначаны своеасаблівасці тэатральнай культуры Віцебскага рэгіёна ў азначаны перыяд, прынцыпы яе функцыяніравання ў спецыфічных гістарычных умовах і ў шырокай тэатральна-культурнай прасторы.

**Апрабацыя вынікаў даследавання.** Матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваліся пры распрацоўцы курсаў лекцый «Гісторыя беларускага тэатра» і «Крыніцазнаўства», якія чытаюцца аўтарам у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Вынікі даследавання адлюстраваны ў артыкулах, матэрыялах і тэзісах канферэнцый, апублікаваных у друку. Асноўныя палажэнні дысертацыі дакладваліся на Семінары маладых літаратурных і мастацкіх крытыкаў «На шляху да сталасці: Стан і перспектывы развіцця нацыянальнай мастацкай крытыкі» (Мінск, 2001); на рэспубліканскіх навукова-творчых канферэнцыях Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў: «Нацыянальная мастацкая школа: праблемы трансфармацыі на сучасным этапе» (Мінск, 2002); І-я Няфёдаўскія чытанні «Беларускае мастацтва: гісторыя і сучаснасць» (Мінск, 2003). З асноўнымі палажэннямі дысертацыі аўтар азнаёміў удзельнікаў Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Актуальные проблемы мировой художественной культуры» (Гродна, 2002), Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў «НИРС – 2001» (Віцебск, 2001); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Духовно-нравственное и физическое оздоровление общества: состояние, проблемы, поиск эффективных форм и методов» (Мінск, 2003); Навукова-практычнай

канферэнцыі МДЛУ «Культурологические аспекты вузовского образования» (Мінск, 2003).

**Апублікаванасць вынікаў даследавання.** Па тэме і выніках даследавання надрукавана 9 артыкулаў у навуковых выданнях. Артыкулы ў часопісах – 1, у навуковых зборніках – 4, матэрыялы навуковых канферэнцый – 3, тэзісы дакладаў – 1. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў склаў 40 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, якая ўключае 3 главы, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і дадаткаў. Аб'ём дысертацыі складае 98 старонак. Спіс выкарыстаных крыніц уключае 131 найменне на беларускай і рускай мовах і займае 9 старонак. Дадаткі складаюць 15 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Ва ўводзінах** даецца агульная ацэнка стану навуковай праблемы ў сферы тэатразнаўства, акрэслена кола пытанняў, якія патрабуюць навуковага вывучэння, і вызначаны напрамак дысертацыйнага даследавання. Пад тэатральнай культурай разумеюцца сцэнічнае мастацтва ўвогуле (драматургія, акцёрскае і рэжысёрскае мастацтва, сцэнаграфія) і неад'емныя ад яго аспекты, у прыватнасці: глядацкая аўдыторыя, тэатральная крытыка, цэнзура, арганізацыя тэатральнай справы, тэатральныя будынкі. Гэтыя элементы самым цесным чынам залежалі адзін ад аднаго, таму аўтару прадстаўляецца мэтазгодным разглядаць іх у непасрэдным узаемадачыненні і ўзаемадзеянні ў межах аднаго даследавання.

**У першай главе «Тэарэтычныя аспекты і прынцыпы даследавання»** змешчана **гістарыяграфія пытання**, прыведзены агляд літаратуры па тэме, ахарактарызаваны асноўныя тэатразнаўчыя працы, у якіх закраналіся праблемы дысертацыі, і выяўлены нявырашаныя пытанні.

Да цяперашняга часу спецыяльных даследаванняў па тэме не праводзілася. Працы, якія прысвечаны гісторыі тэатральнага мастацтва Беларусі, утрымліваюць толькі фрагментарныя звесткі аб тэатры Віцебскай губерні XIX – пачатку XX ст. Асобныя аспекты праблемы былі закрануты ў калектыўнай працы «Гісторыя беларускага тэатра», «Тэатральнай Беларусі: Энцыклапедыі», манаграфіях «Русский драматический театр в Белоруссии XIX в.» Ю.Пашкіна, «Русско-белорусские культурные связи во второй половине XIX в.» В.Мелішкевіча, у гістарычным нарысе «Художественная культура Витебска» А. і Ю.Русецкіх. Разрозненыя дадзеныя аб тэатральным жыцці ў губерні змяшчаюцца ў даследаванні С.Сяльверставай, у артыкулах Г.Барышава, Ю.Пашкіна, В.Сімаковай, І.Абрамавай, Е.Ендрыхоўскага, І.Ліснеўскага, К.Шалахоўскага.

**Крыніцазнаўчую базу дысертацыі** складае мноства разнастайных *рукапісных і друкаваных тэатральных, культурна-гістарычных, адміністрацыйна-заканадаўчых і фінансава-гаспадарчых крыніц.*

Асаблівую важнасць для даследавання прадстаўляюць **архіўныя дакументы XIX – пачатку XX ст.** У Нацыянальным гістарычным архіве

4. Па разнастайнасці з'яў тэатральнага жыцця Віцебская губерня ў XIX – пачатку XX ст. не саступала іншым гарадам Беларусі і Расійскай імперыі. Пэўны ўплыў на тэатральны працэс у рэгіёне аказвалі цесныя кантакты з польскай, рускай і ўкраінскай культурамі. Выступленні польскіх вандроўных труп садзейнічалі нараджэнню інтарэса да тэатральнага мастацтва ў гарадскога насельніцтва Віцебскага рэгіёна. Менавіта праз прадстаўленні польскіх артыстаў пачаў складвацца камерцыйны механізм развіцця тэатральнай справы. У 1840-1860-я гг. вельмі папулярнымі былі «Стары муж» Ю.Кажанеўскага, «Муж і жонка» А.Фрэдры, «Чыншавая шляхта» К.Камінскага, «Старая рамантычка» С.Багуслаўскага.

З 1870-х гг. пачынаюцца эпізадычныя гастролі рускіх і ўкраінскіх артыстаў, якія ў 1890-я гг. набылі рэгулярны характар. На мяжы стагоддзяў выступленні Александрынскага і Малога тэатраў, спектаклі з удзелам братоў Адэльгейм і іншых знакамітых рускіх артыстаў мелі значны водгук у грамадстве. Гледачы далучаліся да прафесійнага сцэнічнага мастацтва і знаёміліся з драматургіяй А.Чэхава, М.Горкага, Л.Андрэева, Л.Талстога, якая атрымала вялікае грамадска-палітычнае значэнне.

Вельмі блізкімі беларускаму ўспрыманню былі выступленні ўкраінскіх артыстаў (ансамблевасць і эмацыянальнасць выканання, украінскі каларыт, насычанасць дзеяння спеўнымі і танцавальнымі элементамі). Праз іх прадстаўленні абуджалася цікавасць да народнага побыту, фальклорных пачаткаў творчасці. Ужо ў першай палове XIX ст. адбылося знаёмства гледачоў рэгіёна з украінскай драматургіяй: шырокую вядомасць на Віцебшчыне атрымалі "Наталка-Палтаўка" М.Катлярэўскага і "Маскаль-чараўнік" А.Грэцка-Аснаўяненкі. З 1890-х гг. кожны летні сезон у гарадах рэгіёна працавала па некалькі ўкраінскіх таварыстваў, якія карысталіся вялікай папулярнасцю ў публікі. Прычым многія з іх былі ўкраінска-беларускімі па акцёрскім складзе. Такія ўзаемасувязі – ад спарадычных дачыненняў да пастаяннага ўзаемадзеяння – з'явіліся важкім фактарам станаўлення тэатральнай культуры Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст. [2; 5; 9].

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ


**Артыкулы ў навуковых часопісах:**

1. Валанцэвіч Н.С. Тэатр і цэнзура ў XIX ст. (Дзяржаўны кантроль за тэатрам на Беларусі) // Запіскі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Альманах 2001/4. – Мн.: БДАМ, 2004. – С.52—56.

**Артыкулы ў навуковых зборніках:**

2. Нечаева Н.С. Школьный театр в учебных заведениях Витебской губернии // Проблемы истории литературы. – Вып. 11. – М.: МГОПУ им. М.А.Шолохова, 2000. – С. 95—98.
3. Нячаева Н.С. Уплыў грамадска-палітычных працэсаў на развіццё тэатральнай культуры Віцебскай губерні ў XIX ст. // Состояние и перспективы развития национальной художественной критики: Сб. трудов молодых критиков. – Мн.: БГАИ, 2001. – С. 64—69.
4. Нечаева Н.С. Влияние общественно-политических процесссов на развитие театральной культуры Витебской губернии в XIX веке // Проблемы истории литературы. – Вып. 13. – М.: МГОПУ им. М.А.Шолохова, 2001. – С. 199—202.
5. Нечаева Н.С. Развитие театральной культуры в Витебской губернии в начале XX века // Проблемы истории литературы. – Вып. 14. – М.: МГОПУ им. М.А.Шолохова, 2001. – С. 203—207.

**Матэрыялы і тэзісы дакладаў навуковых канферэнцый:**

6. Нячаева Н.С. Змены ў рэпертуарнай практыцы тэатраў Віцебскай губерні ў XIX ст. // Актуальные проблемы мировой художественной культуры: Мат-лы междунар. научн. конф. Гродно, 25—26 апреля 2002 года / ГГУ им. Я.Купалы, 2002. – Ч. 2. – С. 63—66.
7. Валанцэвіч Н.С. Грамадска-культурнае асяроддзе гарадоў Віцебскай губерні ў XIX ст. // I-я Няфёдаўскія чытанні (Беларускае мастацтва: гісторыя і сучаснасць), Мат-лы рэспубл. навук.-творч. канф. Мінск, 18—19 лютага 2003 г. / БДАМ. – Мн., 2003. – С. 94 – 101.
8. Нячаева Н.С. Аматарскія тэатральныя гурткі і таварыствы ў Віцебскай губерні 1880—1910-х гадоў // Нацыянальная мастацкая школа: праблемы трансфармацыі на сучасным этапе: Мат-лы рэспубл. навук.-практ. канф. Мінск, 23—24 мая 2002 года / БДАМ. – Мн., 2003. – С. 115—117.
9. Нячаева Н.С. Уплыў сацыяльна-эканамічных працэсаў на развіццё тэатральнай культуры Віцебскай губерні ў XIX ст. // IV Респ. науч. конф. студентов и аспирантов Беларуси "НИРС - 2001": Тезисы докладов: В 2 ч. / УО "ВГУ им. П.Машерова"; Редкол.: Г.И.Михасёв (гл. ред). – Витебск: Изд-во ВГУ им. П.Машерова, 2003. – Ч. 2. – С. 95-97.

# РЭЗЮМЕ

Валанцэвіч Наталля Сяргееўна

## Тэатральная культура Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст.

**Ключавыя словы:** тэатральная культура, рэгіянальныя асаблівасці, тэатральнае жыццё віцебскай губерні XIX – пачатку XX ст., арганізацыя тэатральнай справы, камерцыйны тэатр, русіфікатарская палітыка, цэнзура, тэатральныя будынкі, дэмакратызацыя глядацкай аўдыторыі, рэпертуарная практыка, акцёрскае і рэжысёрскае мастацтва, сцэнаграфія, тэатральная крытыка, тэатральнае аматарства.

**Аб'ект даследавання** – ўвесь комплекс тэатральна-культурных з'яў, што склаліся і функцыянавалі на тэрыторыі Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст.

**Прадмет даследавання** - асаблівасці тэатральнай культуры Віцебшчыны XIX – пачатку XX ст. як сістэмы, якая сфарміравалася ў працэсе ўзаемадзеяння з аналагічнымі з'явамі ў культурах суседніх народаў.

**Мэта работы** – выяўленне характэрных рысаў і раскрыццё сутнасных заканамернасцей развіцця тэатральнай культуры Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст.

**Асноўныя метады даследвання** – метад сістэмнага падыходу, метады структурнага і функцыянальнага аналізу, метад параўнальнага аналізу, метад статыстычнага аналізу.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў** – на аснове крыніц, выяўленых аўтарам у архівах і бібліятэках Беларусі і Расіі, **упершыню** здзейснена фундаментальнае комплекснае даследаванне тэатральнай культуры Віцебскай губерні XIX – пачатку XX ст., вызначаны яе асноўныя мастацкія і арганізацыйныя характарыстыкі, заканамернасці функцыянавання ў складаных гістарычных умовах, узаемадзеянне з іншымі культурамі.

Вынікі даследавання можна прымяняць пры чытанні курсаў па гісторыі і тэорыі культуры, тэатральнай крытыкі і журналістыкі, пры стварэнні навукова-практычных выданняў і вучэбных дапаможнікаў па айчыннай гісторыі, гісторыі мастацтва і культуралогіі, метадалагічныя прынцыпы могуць выкарыстоўвацца ў навуковых даследаваннях, пры вывучэнні праблем рэгіянальнай культуры. Матэрыялы даследавання могуць выкарыстоўвацца ў музейнай дзейнасці і пры стварэнні базы дадзеных аб тэатральнай культуры Беларусі XIX – пачатку XX ст.

## РЕЗЮМЕ

Волонцевич Наталья Сергеевна

**Театральная культура Витебской губернии в XIX – начале XX ст.**

**Ключевые слова:** театральная культура, региональные особенности, театральная жизнь витебской губернии XIX – начала XX века, организация театрального дела, коммерческий театр, русификаторская политика, цензура, театральные здания, демократизация зрительской аудитории, репертуарная практика, актёрское искусство, сценография, театральная критика, театральное любительство.

**Объект исследования** – весь комплекс театрально-культурных явлений, сложившийся и функционировавший на территории Витебской губернии в XIX – начале XX в.

**Предмет исследования** - особенности театральной культуры Витебщины XIX – начала XX в. как системы, сформировавшейся в процессе взаимодействия с аналогичными явлениями в культурах соседних народов.

**Цель работы** – выявление характерных черт и раскрытие сущностных закономерностей развития театральной культуры Витебской губернии в XIX – начале XX в.

**Основные методы исследования** – метод системного подхода, методы структурного и функционального анализа, метод сравнительного анализа, метод статистического анализа.

**Научная новизна и значимость полученных результатов** – на основании источников, выявленных автором в архивах и библиотеках Беларуси и России, **впервые** осуществлено фундаментальное комплексное исследование театральной культуры Витебской губернии XIX – начала XX в., определены её основные художественные и организационные характеристики, закономерности функционирования в сложных исторических условиях, взаимодействие с другими культурами.

Результаты исследования можно применять при чтении курсов по истории и теории культуры, театральной критике и журналистике, при создании научно-практических изданий и учебных пособий по отечественной истории, истории искусства и культурологии, методологические принципы могут использоваться в научных исследованиях, при изучении проблем региональной культуры. Материалы исследования могут использоваться в музейной деятельности и при создании базы данных о театральной культуре Беларуси XIX – начала XX века.

## SUMMARY

**Volontsevich Natallia Sergeevna**

**Theatrical culture of the Vitebsk Province in the 19'th – the beginning of the 20'th century.**

**Key words**: theatrical culture, regional particular features, theatrical life of the Vitebsk province in the 19'th - the beginning of the 20'th century, organization of the theatrical business, commercial theater, policy of Russification, censorship, theatrical buildings, repertory practice, actor's art, scenography, theatrical criticism, theatrical amateurs.

**The object of research** – the whole system of theatrical – cultural phenomenons that were formed and functioned on the territory of the Vitebsk province in the 19'th – the beginning of the 20'th century.

**The subject of research** – the particular features of the theatrical culture of the Vitebsk province in the 19'th – the beginning of the 20'th century as a system, that has been formed because of the interaction with similar phenomenons in the cultures of others nations.

**The aim of the work** – the discovery of characteristic features and the revelation of fundamental regularities of the development of the theatrical culture of the Vitebsk province in the 19'th – the beginning of the 20'th century.

**The methodological basis** – the method of systematic approach, the methods of structural and functional analysis, the method of comparative analysis, the method of static analysis.

**Scientific novelty and significance of the work** – based on a large number of resources found by the author in libraries and archives of Belarus and Russia, the first complex study of the theatrical culture of the Vitebsk province in the 19'th – the beginning of the 20'th century was carried out, its basic characteristics and laws of functioning in specific historical conditions and in interaction with other cultures were defined.

**Domain of application** – the factological base can be used in teaching History and Theory of culture, Theatrical criticism and Journalism, in creation of scientific – practical publications and study textbooks in History of Fatherland, History of Art and Culture Studies; the methodological principles can be used in scientific researches and in studying problems of the regional culture.